ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ БЕЛАРУСІ

ПРОЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

ОРГАН ЦЭНТРАЛЬНАГА І МЕНСКАГА КОМІТЭТАЎ ЛЕНІНСКАГА КОМУНІСТЫЧНАГА САЮЗУ МОЛАДЗІ БЕЛАРУСІ

№ 113 (495) Субота, 8 кастрычніка 1927 г. | Выходзіць тры разы на тыдзень у аўторак, чацьвер і суботу | Год выд. VII. | Рэдактар прымае ад 12 да 2 гадз. дню. Сакратар ад 10—12 і ад 2—3 гадз. Тэл. № 903. | Адрас рэдакцыі газэты „Чырвоная Зьмена“: Менск, Комсам. 25.

10 РЫХТУЕМ КАСТРЫЧНІКАЎСКІ ПАДАРУНАК !

Сёньня 11-ты дзень усебеларускага мітынгу чытачоў газэты.

Не паўтарайце памылак.

(Прамова прадстаўніка газэты „Чырвоная Зьмена“).

Як з крыніцы, хвалямі лістоў цякуць у рэдакцыю весткі з усіх канцоў Беларусі аб «суботніку».

«Суботнікі» ахапілі ўсе ячэйкі. Робіцца шмат. Побач з дасягненьнямі, побач з посьпехамі трэба зараз-жа падкрэсьліваць, выяўляць недахопы. «Суботнікі» толькі разгортваюцца, і на недахопах адных ячэек павінны вучыцца, як ня трэба працаваць, іншыя ячэйкі.

Тав. Р. Доўкарні, з Віцебску, паведамляе, што сакратары комсамольскіх ячэек ігольнай фабрыкі «Самаход» і абуткавага прадпрыёмства наогул маюць вельмі «чорны» настрой наконт «суботніка».

— У нас—яны кажуць—нічога ня выйдзе таму, што моладзі ў нас мала ў вытворчасьці, а дарослыя рабочыя ў нас такія, што не захочуць цзельнічаць у «суботніку для беспрытульных».

Вось дык сказана! Вось дык працаўнікі! Не зрабілі ніводнай спробы, каб практычна падрыхтаваць «суботнік», а ўжо апускаюць рукі і палец аб палец не ўдараюць. Калі «ваўкоў», таварышы віцябляне, баяцца, дык лепш «і ў лес не хадзіць».

Віцебскія абутнікі, ігольшчыкі і «Самоходцы»—прыклад формальных паветраных адносін да справы. Мы ўспамінаем аб прыкладзе магазына Дзяржвыдавецтва РСФСР, дзе адзін комсамолец здолеў прыцягнуць да „суботніка“ сем беспартыйных дарослых.

І гэта—не адзін прыклад. Чытачы, якія сачылі за нашым мітынгам, бачылі шмат гэткіх прыкладаў (рабочыя Менскай шкляной гуты, Барысаўскай сернікавай фабрыкі і г. д.).

У тым-жа Віцебску комсамольцы скуранага заводу правялі «суботнік» моладзі. Усё было-б добра, але ячэйка запамятавала невялічкую дробязь: загадзя папярэдзіць моладзь аб «суботніку». Суботнік яны «выпеклі» у тэрміновым парадку (больш падрабязна глядзеце прамову тав. М. Зэліксона).

Вынік:

Зьявілася амаль палова комсамольцаў.

Лічыць, што гэткім чынам створаны «суботнік» прайшоў добра—ні ў якім разе нельга.

Грунтоўная папярэдняя падрыхтоўка, па дзелавому створаны плян—гэта першыя ўмовы посьпеху.

«Суботнік» уваходзіць аднэй з галоўных частак у падрыхтоўку да кастрычнікавых сьвят.

Але праводзячы „суботнік“, нельга запамятаваць аб астатняй рабоце па адзнацы дзесяцігодзьдзя Кастрычніка.

Калі ў гарадох ёсьць больш-менш спрыяючыя ўмовы, дык у вёсцы ўмовы значна цяжэйшыя.

На барацьбу з перашкодамі трэба мобілізаваць усю маладую энэргію, усю ўпартасьць вясковых комсамольцаў.

Усе вясковыя комсамольскія ячэйкі павінны прыняць удзел ва ўсебеларускім конкурсе на лепшую падрыхтоўку, адзнаку і ўдзел ў кастрычнікавым сьвяце.

Падрабязныя ўмовы конкурсу былі надрукаваны ў ва ўсіх газэтах і распаўсюджаны асобным плякатам.

Пажадана, каб гарадзкія ячэйкі, якія шэфствуюць у вёсцы, дапамаглі сваім вясковым братом прыняць удзел у конкурсе, як мага лепш падрыхтавацца да яго.

Мэта конкурсу—узварушыць вясковыя ячэйкі, падштурхнуць найбольш жывое, цікавае і ўрачыстае правядзеньне слаўнай гадавіны.

Школьнікі на „суботніку“.

Прамова т. Ліўшыца.

(Мястэчка Бярэзіна).

Калі мы пачалі працаваць, было зусім яшчэ рана.

З Бярозы падымалася шэрань туману, дзесьці ў хлявох савхозу рыкалі каровы, і на палёх толькі зьбіраліся хлопцы...

Былы панскі маёнтак стаіць на высокім беразе Бярозы, на некалькі вёрст цягнуліся землі былога пана, а зараз на гэтых палетках вучні ўсіх школ мястэчка Бярэзіны пачнуць працаваць на суботнік.

Яшчэ няма сонца. А ужо дзьве школы ў поўным зборы стаяць гатовыя працаваць.

Яшчэ няма кіраўнікоў работамі, яшчэ ня прывезьлі рыдлёвак, а хлопцаў прыходзіць усё больш і больш.

Мы ўглядаемся ў абкружаючае. Поле наша на высокім беразе, унізе пабліскваючы гультаявата рухаецца рака, недзе ў далячыні раскінуліся вёскі, парыжэўшыя шнуры палёў. Цягнуцца кудысьці далёка далёка.

Ціха...

Але вось на рагу загрукацелі фурманкі: гэта нам вязуць рыдлёўкі.

Мы пачынаем працаваць. Усяго сабралася каля 200 чалавек. На полі невялічкі мітынг. Адзін за другім зьмяняюцца прамоўцы, кожны гаворыць аб суботніку, аб вялікай традыцыі былых гэроічных дзён.

. . . .

Поўдзень.

Мы ўжо скончылі капаць на першай дзесяціне.

Ужо выстраіліся піраміды бульбы, і сонца паднялося высока, высока.

Хутка ідзе праца, хутка растуць новыя і новыя піраміды...

Загадчык савхозу, рабочыя дапамагаюць чым можна, яны дармова далі коняй з фурманкамі Рабочыя таксама дармова работаюць, яны ідуць з канём за плугам вывораваючы бульбу.

Ужо канчаецца дзень... Гэта толькі першы дзень. Мы выкапалі бульбу на двух дзесяцінах. Праца дасьць вялікую карысьць. Будуць плаціць ад дзесяціны, дакладная лічба пакуль ня высьветлена.

Зморавыя ідзём...

Ужо цёмна. У вокнах местачковых хат сьвет, і пад доўга незмаўкаемыя песьні, разыходзімся па хатах.

Віцебск заварушыўся.

Прамова Міхася Зеліксона.

Комсамольская ячэйка скуранога заводу першая ў Віцебску правяла Кастрычнікавы суботнік моладзі.


Як асноўны недахоп, трэба адзначыць адсутнасьць якой бы-та ні было падрыхтоўчае работы. Значэньне суботніка нават ня было растлумачана комсамольцам і беспартыйнаў моладзі. Некаторыя таварышы аб ім нават і зусім нічога ня ведалі. Так, у суботу на пасяджэньні бюро, якое адбывалася пасьля работы, было ўхвалена рашэньне аб тым, каб назаўтра правесьці суботнік. Ня ўсіх пасьпелі паведаміць, дзякуючы чаму зьявілася не на многа больш паловы комсамольцаў. Комсамолец Рыўлін, калі яго ў суботу у вечары, паведамілі аб суботніку, рашуча адмовіўся прыйсьці і нават заявіў, што „гэта вам не 20-ты год“. Ня прышоў таксама і стары комсамолец-партыец тав. Аспават Яфім, ня гледзячы на тое, што ён загадзя многа хваліўся і абяцаў паказаць моладзі, як работалі старыя комсамольцы ў мінуўшыя баявыя часы.

Ня гледзячы на усе адмоўнасьці, суботнік усё-ж прайшоў больш-менш добра.

Суботнік урэшце даў на карысьць беспрытульных дзяцей—20 руб. Ячэйча думае правесьці яшчэ адзін суботнік.

„Памятай дзень суботні...“

ЦК УсеЛКСМ праводзіць суботнік на карысьць беспрытульных.



Пастарому. Панашаму.

Заробім 20 рублёў.

Прамова сэкратара Машчаніцкай ячэйкі.

Мы праводзім падрыхтоўку. Ячэйка два разы абгаварвала пытаньні суботніка.

Згаварыліся з загадчыкам млына, комсамольцам нашай ячэйкі т. Ліхтэрманам, які дае працу ўсёй ячэйцы.

Будзе працаваць 15 ч. На папярэдніх падліках мы выручым 20 р., разгрузім за «суботнік» увесь млын.

Зьбярэм каля тысячы рублёў.

Прамова тав. Раткевіча, Барысаў.


Таварышы! Да таго, што адзначыў тав. Клопаў у папярэднім нумары «Чырвонай Зьмены» лічу неабходным дадаць наступнае:

— Ужо праведзена нарада гаспадарчых працаўнікоў разам з сакратарамі комсамольскіх і партыйных ячэек.

«Суботнік знайшоў» добры водгук з боку ўсёй комсамольскай організацыі, а таксама з боку часткі беспартыйнай моладзі і дарослых рабочых.

Практычнае правядзеньне суботніка пачнецца 16 кастрычніка. Па вызначанаму пляну будуць пушчаны поўным ходам фабрыка «Чырвоная Бярэзіна», завод імя Р. Люксэмбург, прадпрыемствы камбінату, лесапільны завод, друкарня і працколектыў, амаль поўным ходам будзе працаваць шкляная гута імя Дэмбаля. На заводзе Комінтэрн будзе пушчана некалькі цэхаў.

Па папярэдняму падліку ад суботніка можна будзе сабраць **каля 1000 рублёў.**



Будзе працаваць 450 чалавек.

Прамова сакратара колектыву ЛКСМБ фабрыкі „Чырвоная Бярэзіна“ тав. Кроля.

Пытаньне аб «суботніку» разглядалася ў нас на пасяджэньні бюро комсамольскага колектыву.

Тут была вынесена прапанова, каб у выхадны дзень пусьціць на поўны ход фабрыку. Гэтую прапанову падтрымала і бюро партыйнага колектыву.

Такім чынам, мы створым адну зьмену чалавек у 450, і будзем працаваць 4 гадзіны. Такім чынам мы думаем зарабіць больш за 425 рублёў.

Зараз праводзіцца ў нас вялікая падрыхтоўчая работа ў цэхах. Вядзецца агітацыя сярод асобных дарослых рабочых за ўдзел у «суботніку».

І мы просім слова.

Прамова беспрацоўнага тав. Мазеля.

Таварышы! У прамовах на ўсебеларускім мітынгу ўвесь час чуеш аб вялікай падрыхтоўцы да суботніку рабочай, сялянскай нават і вучнёўскай моладзі.

А аб удзеле ў суботніку беспрацоўных ні слова. Намойму беспрацоўная моладзь таксама павінна прыняць удзел у суботніку. Для гэтага прапаную:

Абвясьціць аднадзённую добраахвотную мобілізацыю беспрацоўнай моладзі і накіраваць кожнага па сваёй профэсіі на той ці іншы завод, дзе ён будзе працаваць разам з моладзьдзю гэтага заводу.

Ня трэба баяцца таго, што ня хопіць месца. Мне здаецца, што ня ўсе дарослыя будуць працаваць у часе суботніка, так што іх месца могуць заняць беспрацоўныя.

Я лічу, што беспрацоўная моладзь, асабліва комсамольцы, прымуць актыўны ўдзел у правядзеньні суботніка.

Па прадпрыёмствах „Белшчацына“

Загад № 28.

§ 1.

Прызнаючы важнасьць правядзеньня комсамольскімі організацыямі па ўсіх прадпрыёмствах суботніка ў карысьць беспрытульных прапануем Вам аказваць усялякае садзейнічаньне мясцовым комсамольскім організацыям у правядзеньні гэтага суботніка на нашых прадпрыемствах і вылучыць для гэтага неабходную колькасьць сырцу.

Старшыня Праўленьня **ШТЭЙНЭР.**

Тры дні працы.

Прамова таварыша Міхася.

(Вільшчынская ячэйка ЛКСМ).

Для суботніка ў Вільшчынскай школе сялянскай моладзі вызначылі 3 дні

За першы дзень частка комсамольцаў асушала балота аднаму бедняку.

У другі дзень—направяць папсаванную дарогу і дапамогуць працаваць некалькім беднякам і аднаму пагарэльцу.

Трэці дзень—нядзелю—усе комсамольцы і значная частка беспартыйнай моладзі будуць капаць бульбу. Заробленыя грошы пайдуць у карысьць беспрытульных.

Адміністрацыя школы цалком пашла насустрач (дала коняй і г. д.).

Варушым справу.

Прамова тав. Мэйсрава

(Клімавічы, Магілеўскай акругі).

Ячэйка пры Цімашоўскім савхозе адпрацавала выходны дзень—граблі канюшыну—за што атрымала 12 рублёў.

Профшкольская ячэйка бярэ заказ на 35 рублёў.

Раднянская ячэйка за капаньне бульбы атрымала сем рублёў.

Зараз райкамол вядзе перамовы з адпаведнымі ўстановамі аб прадстаўленьні працы для комсамольцаў гарадзкіх ячэек.

Заводы будуць пушчаны цалкам.

Прамова тав. Ушкевіча.

(Намесьнік старшыні праўленьня Лесбелу).

На нашых прадпрыемствах падрыхтоўка пачалася. На некаторых заводах сіламі моладзі будуць пушчаны **асобныя цэхі.**

Але большасьць заводаў будзе працаваць цалкам. Моладзь уцягвае акрамя партыйцаў, яшчэ і старых рабочых, беспартыйных.

У працягу некалькіх дзён **рабочыя будуць адрабляць зьверх нормы.**

Гэты мэтад правядзеньня суботніка найлепшы, бо **нядзеля** усё-ж для рабочага павінна і застацца днём адпачынку.

Трэба хутчэй узяцца за справу ўцягненьня ўсіх дарослых рабочых заводаў.

За дзень--40 пудоў аўса.

(Прамова сакратара Белічанскай ячэйкі ЛКСМБ Бярэзінскага раёну).

Таварышы!

2-га кастрычніка мы правялі суботнік. Калі-б хто убачыў нашу работу, зробленую 13 чалавекамі за адну нядзелю, дык ніколі не паверыў-бы, што гэта зроблена за адзін дзень.

Наша ячэйка рыхтавалася доўга. Два тыдні таму назад, мы абгаварылі гэтае пытаньне на бюро ячэйкі.

Нарэшце, пытаньне перанесьлі на сход. І на гэты раз сход зацягнуўся болей звычайнага; на гэты раз было больш чым заўсёды людзей на сходзе.

Мы рашылі **абмалаціць авёс** камітэту сялянскай узаемадапамогі.

І другога кастрычніка праца была зроблена. Мы абмалацілі **40 пудоў** аўса.





АБГАВАРВАЕМ ПЫТАНЬНЕ „АБ ВУЧНЕЎСТВЕ“.

Як абучаюцца вучні.

Вучняў у нас ня многа—9 чал. Коратка скажу аб кожным.

Трое абучаюцца ў загатоўчым аддзяленьні.

Лепш за ўсіх пасьпявае Сагаловіч К. Ён работае ўжо 3-ці год. Вельмі цікавіцца работай. Калі яшчэ і ня трэба было, прасіў аб дазволе работаць 8 гадзін.

Рабочы Бацьвіньнік, да якога ён прымацаваны, абучае яго добра. Паміж імі—добрыя таварыскія адносіны.



Рабочы Бацьвіньнік і вучань Сагаловіч.

Другі вучань—Юдэлевіч—таксама цікавіцца работай, але яна хутчэй хоча кваліфікавацца, каб атрымаць большую пэнсію.

Не падабаецца ёй работаць на ўжо вядомай рабоце.

Нельга сказаць. што адносіны яе да абучаючага рабочага Кугеля—добрыя. Яна крычыць на яго, а завочна і лае.

Абучэньне вучня Зальцман за апошнія часы ўжо наладжваецца. Яна старанна адносіцца да работы. Паміж ёю і абучаючым яе рабочым—адносіны добрыя.

У кацяжным аддзяленьні вучань Баброўскі ўжо хутка выйдзе з „броні“.

Дрэнна абстаіць справа з абучэньнем вучня машыннага аддзяленьня—Галенсона.

Рабочы Цырлін да якога ён прымацаваны амаль увесь час працуе на машыне, а Галенсон займаецца падсобнай работай.

Мог-бы Цырлін кожны дзень на часы два даваць Галенсону работаць на машыне, а самому сачыць за яго рабочай, але ён гэтага ня робіць і Галенсон кваліфікацыі не абучаецца.

Зусім дрэнна справа з абучэньнем вучня штамповачнага аддзяленьня—Шляпачніка.

Далі яму прасаваць абсацы (не кваліфікаваная работа), а на машыне зусім не абучаюць.

Абучаць-жа яго трэба: раскройцы цьвёрдага тавару, разбірацца ў асорцімэнце скуры і работаць на плянэце-машыне.

Яго трэба прымацаваць да рабочага Гурэцкага.

Вучань Раскін (сталярнае аддзяленьне) добра абучаецца кваліфікацыі. Ён цікавіцца работай. Адносіны з майстрам—добрыя.

Трэба сказаць, што некаторыя майстры баяцца абучаць вучняў хуткім тэмпам таму-каб яны потым не маглі адняць у іх заробак.

Дзбанэк.

МОЛАДЗЬ І МАЙСТРЫ.

Твар майстра.

Хто яны, гэтыя майстры, якія кіруюць работай усіх цэхаў фабрыкі?

— Тав. **Асіповіч**—майстар штамповачнага аддзяленьня. Ён, як нельга болей, блізкі да запатрабаваньняў моладзі, бо амаль усіх іх, працуючых на фабрыцы, навучыў рабоце.

Тав. Асіповіч доўгі час працаваў на фабрыцы ў якасьці кіраўніка вучнёўскай брыгады. Зараз ён зьяўляецца старшынёй камісіі па пераводзе вучняў у разрады і сябрам бюро партыйнай ячэйкі.

Т. т. **Кроль** (загатоўчае аддзяленьне), Шыманскі (нацяжное аддзяленьне) і Герайціс (прыёмшчык). Яны таксама яшчэ нядаўна былі шэраговымі рабочымі фабрыкі, але дзякуючы сваёй прыкладнасьці, высунуты кіраўнікамі цэхаў.

Шмат гадоў яны працавалі на вытворчасьці, пераносячы ўсе «прелести» навучаньня пры царызьме.

Здаецца: хто, як не яны, прайшоўшыя гэткі шлях, могуць добра падыйсьці да рабочых, якімі яны зараз кіруюць?

„Ва ўсім вінаваты майстар“.

Частка моладзі зразумела займаемае майстрам месца ў вытворчасьці, яго ролю і прызначэньне.

Але толькі частка!

Шмат-жа маладых рабочых кажуць аб тым, што майстры глядзяць на моладзь, як і ў ранейшыя часы. Яны прывыклі бачыць у майстру—эксплёататара, зацікаўленага толькі ў адным: больш выжаць сокаў з рабочых.

Чым-жа кепскія майстры?

— Моладзь абвінавачвае іх у вынясеньні вымоў рабочым нават і за 5 хвілін спазьненьня на работу.

Мы добра праверылі і аказалася: за 5 хвілін вымоў нікому не давалася. Яны выносіліся за больш працяжныя спазьненьні, за нядбайныя адносіны да працы.

І хіба майстар вінаваты ў тым, што сярод рабочых, у тым ліку і сярод моладзі, маюцца яшчэ гультаі і нядбайшчыкі?—Абавязак майстра—сачыць за выкрыцьцём усіх гэтых ненармальнасьцяў, бо ён нясе адказнасьць за рабочых свайго цэху.

Ня вышукваць «козла отпущения», а ўзмацняць працоўную дысцыпліну,—вось чым трэба заняцца камсамольцам і моладзі фабрыкі.

Майстры аб моладзі.

Мы абыходзілі ўсе аддзяленьні фабрыкі і гутарылі па пытаньні аб моладзі з майстрамі.

Па думцы старэйшага майстра фабрыкі—т. **Мацісўскага**—у агульным, адносіны моладзі да майстроў—добрыя, тава загады іх моладзь выконвае.

— Мяне моладзь слухае таму, што я ад іх патрабую выкананьня ўсіх загадаў,—кажа майстар **Шыманскі.**

Але прыходзіцца прызнаць, што ўзаемаадносіны моладзі з майстрамі ўсё-жа **прымушаныя.**

Неабходна, каб моладзь уцяміла значэньне майстра і яго загады выконвала «не за страх, а за совесть».

Майстар **Асіповіч** усім здаволены, акрамя таго, што малады рабочы яго цэху—комсамолец **Шніпель**—часта позьніцца на працу і нават **зрабіў 2 прагулы** (гэта, можна сказаць, адзіныя прагулы на ўсёй фабрыцы).

А ячэйка што робіць?

Спачатку нас упэўнівалі ў тым, што ўзаемаадносіны моладзі з майстрамі—найлепшыя. Але намі шмат выяўлена і кепскага.

Зараз мы пытаемся: што-ж зрабіла комсамольская ячэйка для таго, каб растлумачыць моладзі розьніцу майстра нашай савецкай фабрыкі, ад майстра капіталістычнай фабрыкі і зьнішчыць сярод моладзі стварыўшыяся, па грунце гэтага незразуменьня, нездаровыя настроі?

Трэба адзначыць, што ячэйка наогул не займалася пытаньнямі аб узаемаадносінах моладзі з майстрамі. Прыблізна год таму назад была склікана нарада па гэтым пытаньні, а з тых часоў—«усё спакойна».

Міх. Зак.

Сёньня 5-ы дзень агляду

Адказы Асіповіча

майстра штамповачнага аддзяленьня.

Тав. Гурэцкаму: Шоры выдаюцца рабочым па нумарох асартымэнту, але некаторыя з іх бываюць крыху шырэй, альбо вузей, што тлумачыцца адсутнасьцю машыны для іх рэзкі.

Дырэктар фабрыкі—тав. Шэрман да гэтага дадаў, што машыну для рэзкі ён думае на гэты год набыць, але яшчэ добра невядома, таму што няма ліцэнзіі.

Працяг адказу Асіповіча: Шоры мочацца, але бывае, што верхнія з іх, альбо калі яны раскіданы, накуль дойдуць да непасрэднага іх скарыстаньня, то крыху высыхаюць. Тав. Гурэцкі хоча, каб шоры былі вельмі мокрымі. Гэтага рабіць нельга, бо яны будуць псавацца.

Тав. Іткіну: З чарговага панядзелка пачнецца пераабарудаваньне ўсяго штамповачнага аддзяленьня і яго машына будзе папраўлена і пастаўлена добра (на сваё месца) у першую чаргу, што будзе зроблена к 1 лістапада.

Есьць частка старых штампаў, але яны ў процэсе працы замяньваюцца новымі.

Тав. Каплану: Некаторыя машыны сваечасова не рамантуюцца толькі таму, што ў гэты-ж час трэба рамантаваць болей важныя машыны, ад якіх можа парушыцца ўвесь процэс вытворчасьці. Наогул-жа, калі толькі якая-небудзь машына псуецца, яе стараюцца зараз-жа направіць.

АД РЭДАКЦЫІ: Адказы майстра Асіповіча зацьверджаны дырэктарам фабрыкі.

Шыманскі адказвае.

Моладзь крыўдзіцца на мяне таму, што я патрабую, як майстар, ад яе выконваць усё тое, што датычыцца вытворчасьці.

З мяне патрабуе адміністрацыя, а я з моладзі. Я паказваю ёй недахопы ў рабоце. А яна за гэта на мяне крыўдзіцца, кажа, што я маю дрэнныя за яе адносіны.

Асабістых спраў я ня маю з моладзьдзю. Трэба сказаць, што мае паказаньні моладзь выконвае ўважліва. Яна зацікаўлена ў вытворчасьці.

Жальбы за вымовы пры спазьненьні 5 хвілін няправільны. Такіх вымоў у нас ня бывае.

Адносна ўзаемаадносін моладзі з дарослымі рабочымі.—Кожны ў нас мае сваю грунтоўную работу і ніякіх спраў ня мае ў часы работы з дарослымі рабочымі. Але верна тое, што рабочы К. адмовіўся прыйсьці на работу з-за моладзі.

Просьба да моладзі сумленна адносіцца да сваёй работы і выконваць у вытворчасьці тое, што ад яе патрабуецца.



Штурхаецца і лаецца...

Да 5 гадзін увечары я падаў матар'ял глазуршчыкам. У іх зрабіўся запас. Нездаволены гэтым падышоў да мяне прыёмшчык работы тав. Герайціс і пачаў лаяць за тое, што я падаў такі вялікі запас. Ён мяне штурхануў да ваганетак і лаяўся.

Ці павінна гэта так быць?

Малады рабочы ГАРЭЛІК.



Рабочыя атрымоўваюць «Чырвоную Зьмену».

ЛЕПШАЕ Ў АТРАДАХ.

Агляд піонэрскіх дасягненьняў.

Ад зоркі да зоркі.

(Барысаў, атрады саюзаў краўцоў і друкароў).

Лета. Дзеці ўжо не займаюцца ў школах. Чаму-б не наладзіць нам начлег у лесе?

Некалькі піонэраў накіраваліся ў лес выбраць добрае месца. Знайшлі каля лесу невялічкую палянку, якая раней належала хутараніну. За адзін рубель нанялі хлеў, поўны сьвежым сенам. І толькі пасьля гэтай падрыхтоўкі абодва прафсаюзныя атрады накіраваліся ў паход.

На высокім дрэве павесілі сьцяг. Хутка гэты сьцяг убачылі дзеці з хутароў. Яны прыбеглі к нам і да апошняга часу гулялі з намі, купаліся, спалі на сьвежым сене.

Павадыр разам з 6-цю піонэрамі засталіся дзяжурыць у лесе. (Кожны піонэр дзяжурыў па дзьве гадзіны). А астатнія піонэры разам з неарганізаванымі дзяцьмі купаліся, гулялі ў футбол.

З апэтытам мы елі падрыхтаваную дзяжурнымі шамоўку. А пасьля шамоўкі чыталі апавяданьні.

У часе чытаньня, к нам падышла старая сялянка.

— Я ўдава—плакала яна,—і некаму мне згрэбсьці сена.

Мы кінулі чытаньне, узялі граблі і дапамаглі беднай удаве.

Як добра і прыемна было купацца пасьля працы, ды яшчэ—карыснай працы. К вечару бадзёрыя і радасныя мы пайшлі дамоў.

Г. Р.



Гульня ў кракет.

„Памятка павадыра“.

(Смалявічы).

Кіраўніцтва да гэтага часу ў піонэрорганізацыі зьяўляецца самым балючым пытаньнем, бо мы падчас не дапамагаем павадыру работаць, а загружаем яго галаву зусім незразумелым матар'ялам.

З гэтай задачай кіраўніцтва добра справілася **Смалявіцкае раённае бюро піонэраў**, выпушчаючы «Памятку павадыра». Рэч, памойму, надта карысная і абходзіцца ня вельмі дорага. Яна складаецца з наступнага матар'ялу: заданыя пытаньні павадырам і адказы, песьні, гульні і загадкі, хроніка работы. У памятку ўваходзяць таксама і новыя формы работы па раёне.

Выпускам такой памяткі мы дамагаемся конкрэтнай дапамогі павадыру, даём магчымасьць кожнаму павадыру пераносіць вопыт сваёй работы ў іншыя атрады.

Зразумела, што такая памятка павінна выпушчацца рэгулярна, бо ў іншым выпадку, ёй будзе грош цана. Ільлін.

На бацькоўскіх варштатах.

(Менск, сельска-гаспадарчыя майстэрні імя Бурбіса).

Было 5 гадзін. Толькі-толькі адхрыпеў гудок. І сьціхаючы па хвілінах, ціха спыніла работу цыркулярка... Сталяры, сутулыя, згорбленыя, выціралі рукі, запэцканыя ў клей, аб сьвежыя смалістыя стружкі, а яны, раскіданыя па падлозе, прыдавалі цэху ўрачыстую прыбранасьць.

Пасьля грукату машын, пастукваньняў малаткоў і долатаў, асабліва ў гэтыя хвіліны былі гучнымі адрывістыя словы майстра:

— Ванька, пакінь-жа інструмант, ды варштаты загадзя падрыхтуй!

— Ды глядзі, Хведар, каб лямпачкі былі ўкручаны.

Праз паўгадзіны, калі ля фабрычных варот зьмянілася варта, прышлі хлапцы. Стройна, зьвяном, увайшлі ў цэх, і пад наглядам майстра пачалі працаваць.

Ішлі дні, з дзён складаліся тыдні, расьлі месяцы, а работа ня ішла. Ніхто ня мог добра трымаць фуганка, ці выстругаць дошку. Але чым больш было цяжка, тым больш нарастала ўпартасьць.

І праўда, цяжкую сталярку, патрабуючую напружанай уважлівасьці, цярплівасьці,—хлапцы перамаглі. І гэтым **ганарыцца атрад сельска-гаспадарчых майстэрняў імя Бурбіса.** Піонэры цяпер добра працуюць на бацькаўскіх, прапацеўшых варштатах. Гнуць плечы адну гадзіну, а пасьля адчуваюць прыемную ламоту ва ўсім целе. Усё роўна што есьці хлеб, у першы раз зароблены.

Атрад улічыў, што сур'ёзная праца ля варштатаў згуртуе хлапцоў, узьніме актыўнасьць і зацікаўленасьць да ўсёй працы атраду. І сталярка выратавала атрад. Ранейшыя сумныя сходы, чытаньне пратаколаў савету, сухія гутаркі ячэйковага прамоўцы (абавязкова з Чэмбэрленам) аб становішчы і наогул — даўно адышлі ў мінулае.

Ня толькі аднэй сталяркай жыве атрад. Вось пераплётная. Працуюць толькі малодшыя піонэры. Сваёй сур'ёзнай і галоўнае карыснай работай атрад заваяваў сымпатыі бацькоў і наогул усіх рабочых майстэрняў. Вось факты: толькі сярод бацькоў на лягер сабралі 120 рублёў. Бацькі заўсёды на зборах, на савеце атрадаў. Заўсёды які-небудзь стары рабочы растлумачвае аб тэхніцы працы якому-небудзь піонэру, дапамагае рабіць якія-небудзь сталярныя рэчы.

Акуратна выдаецца насьценгазэта: радкалегіі прыходзіцца толькі наклейваць нататкі. Ёсьць гурткі: вайсковы, спартыўны. У атрадзе бурліць работа. Вось чаму нашы піонэры з ахвотай ідуць у атрад.

Літа.

„Барацьба за кастры“.

(Мястэчка Ляды, Аршаншчына).

На зборы атраду ўхвалілі: наладзіць катаньне на лодках, пасьля чаго, за мястэчкам, у хмызьняку, правесьці ваенную гульню: «барацьба за кастры».

Роўна ў 6 гадзін увечары ўсе піонэры зьявіліся да ракі. Атрады вылучылі па зьвяне, гэтыя зьвеньні пайшлі ў кусты і там расклалі свае кастры.

Каталіся мы каля 3-х гадзін і роўна ў 9 высадзіліся на бераг, пайшлі да сваіх кастроў.

Быў «загад»: «як мага хутчэй запаліць кастры ворага». Мы пакінулі ў сваіх кастроў абарону і пачалі шукаць «варожыя». Гульня прайшла даволі жыва. Пасьля, у запаленых кастроў, павадыры правялі гутарку «аб жыцьці і барацьбе кітайскіх піонэраў». Позна ўвечары разам з «ворагам» і неарганізаванымі дзяцьмі накіраваліся ў мястэчка. Гэтае катаньне-гульня ажывілі працу атрадаў.

Б.

Бярэзінскія „кітайцы“.

На запалкавай фабрыцы **«Чырвоная Бярэзіна»** працуе піонэр-атрад, адзін з зьвеньняў якога мае назву **«Чырвоны Кітай»**.

Цікава наглядаць за гэтымі маленькімі «кітайцамі».

Кожны піонэр гэтага зьвяна растлумачыць табе, хто такі Чжан-Цзо-Лін, якія ёсьць правіцелі ў Кітаі, растлумачыць табе аб кітайскай рэволюцыі. І заўсёды, калі патрэбен «кітайскі дакладчык», звяртаюцца за дапамогай у гэты атрад.

Кожны піонэр гэтага зьвяна можа добра правесьці гутарку аб Кітаі.

С.

МЫ ДРУЖНА ПАЎСТАЛІ З КАСАМІ, СЯРПАМІ...

Малочныя арцелі дапамагаюць сельскай гаспадарцы стаць больш прыбытковай.

У КОНКУРСЕ НА ЛЕПШУЮ АДЗНАКУ КАСТРЫЧНІКА ПАВІННЫ ПРЫНЯЦЬ УДЗЕЛ УСЕ ВЯСКОВЫЯ ЯЧЭЙКІ ЛКСМБ.

Бервяно да бервяна--хата новая.

Мікалай—комсамолец—самастойны гаспадар—на полі першы працаўнік. Ён ужо зусім падуправіўся: памалаціў ячмень ў добрае надвор'е, бульбу павыбіраў нават і назіму справіўся паараць.

Цяпер Мікалай з выглядам клапатлівага гаспадара пахаджваў па гумне, прыводзіў усё к парадку, падграбаў салому, што ветрам пазрывала з страхі суседа Ахрэма, часам заходзіў у ток палюбавацца снапкамі аўса і жыта, падрыхтаванымі для сельска-гаспадарчай выстаўкі, потым залазіў у грады праверыць „здароўе" качана капусты, які таксама пападзецца для выстаўкі...

Падкачвае Мікалай бярвеньне пад страху, каб ня гніло на дажджы, высьвіствае нейкі цягучы мотыў, а ў думцы рытмічнае уяўленьне—„бервяно да бервяна—хата новая".

Прыслухаўшыся да гэтых слоў, якія выказваў ён сам сабе, Мікалай супыніўся, абапёрся на колік і падумаў:

— Добра сказана „бервяно да бервяна..." І як лёгка гэта зрабіць цэлаю кучаю рук... Гэтыя рукі варта был-б прыкласьці к нашаму клюбу".

Назаўтра быў сход Макаўлянскай комсамольскай ячэйкі, на якім Мікалай запытаўся ў хлопцаў: што мы падарым Кастрычніку?

Памаўчаў крыху, а потым сам адказаў: прапаную адбудаваць клюб, а то зімою што рабіць будзем?

Сход з прапановаю Мікалая згадзіўся. Гэтым-жа днём, вечарам, быў сход сялян вёскі па пытаньню Кастрычнікавай рэволюцыі і Дню Ўраджаю.

На сходзе былі ўсе комсамольцы. Сход прыняў прапанову: на працягу бягучага тыдню адбудаваць клюб. Для гэтай мэты кожны дзень па чарзе назначаецца з вёскі 10 чалавек.

І роўна за тыдзень „амалоджаны" клюб сваёй стройнасьцю і прыгожасьцю прывабляў усіх макалянцаў.

Якраз к гэтаму часу Мікалай даведаўся з сваёй акруговай комсамольскай старонкі „Вясковая Комсамолія" аб конкурсе вясковых ячэек на лепшае праведзеньне сьвяткаваньне дзесяцігодзьдзя Кастрычніка.

— Цяпер нам можна удзельнічаць у конкурсе—ёсьць дзе прыпыніцца, — думаў сабе Мікалай і алоўкам на памятай паперы запісваў прапановы для бюро ячэйкі аб падрыхтоўцы да сьвята, а разам з гэтым і да ўдзелу ў конкурсе.

Гарошын.

Паляпшаем сваё жыцьцё.

(Вёска Карзуны, Сьмілавіцкага раёну, Меншчына).

Да Кастрычнікавай рэволюцыі нашы сяляне жылі ў цемры, у гразі, ды насілі папу апошні свой хлеб.

Цяпер--малюнак зусім іншы: СЯЛЯНЕ ЗАМЕСТ РАНЕЙШАЙ САХІ, АРУЦЬ ЖАЛЕЗНЫМІ ПЛУГАМІ, ЯКІЯ КРЭДЫТНЫЯ ТАВАРЫСТВЫ ДАЮЦЬ БЯДНЕЙШЫМ СЯЛЯНАМ НА ВЫПЛАТУ.

АМАЛЬ У КОЖНАГА ГАСПАДАРА—МАЛАТАРНЯ, А БЕДНЯКІ СКЛАДАЮЦЦА І БУДУЮЦЬ МАЛАТАРНЮ ДЛЯ КОЛЕКТЫЎНАГА КАРЫСТАНЬНЯ. НАВАТ І СПРУНЖЫННЫЯ БАРОНЫ ПАЙШЛІ Ў ХОД, АБ ЯКІХ РАНЕЙ І НЯ СЬНІЛІ.

Зрабілі надзвычайна вялікі крок наперад і ў КУЛЬТУРНЫМ ЖЫЦЬЦІ: САМІ ЗБУДАВАЛІ ШКОЛУ, у якой вучацца ўсе нашы дзеці. АДЧЫНІЛІ ХАТУ-ЧЫТАЛЬНЮ, у якую выпісваецца шмат газэт і кожны грамадзянін можа зайсьці сюды пачытаць і праведаць, што робіцца на сьвеце. ОРГАНІЗАВАЛІ ПАЖАРНУЮ ДРУЖЫНУ, нажылі адзін насос, дзьве бочкі і ўсёй вёскай збудавалі пажарнае дэпо.

КАСТУСЬ РАКІТА.

Падрыхтоўка ў разгары.

(Рагачэўскі раён, Бабруйская акруга).

На раёне шырока разгарнулася падрыхтоўка да правядзеньня сьвяткаваньня дзесяцігодзьдзя Кастрычнікавай рэволюцыі.

Раённай камісіяй складзены плян, які разасланы сельсаветам. Сельсавецкія камісіі складаюць свае пляны, прыстасоўваючы іх да умоў тае ці іншае вёскі.

Уся вясковая грамадзкасьць прымае шчыры ўдзел. Так, напрыклад, **школа з комсамольскай ячэйкай рыхтуе дыяграмы культурнага і гаспадарчага жыцьця сельсавету, юнвяскоры зьбіраюць матар'ял для выпуску юбілейнага нумару насьценгазэты, сельком адпусьціў школе 10 рублёў для падарункаў школьнікам, сельсавет заканчвае пабудову двухкамплектнай школы.**

Пролетарскае сьвята праведзем, як найлепш!

Я. Савіцкі.



НА ЗРУЙНАВАНЫМ ПОЛІ ЗАКРАСАВАЛІ ЎРАДЖАІ.

Замест 6 „панскіх" слуг—паўтысячы савецкіх аграномаў.

У шэрагу мерапрыемстваў па разьвіцьцю сельскай гаспадаркі Беларусі, якія праводзяцца Наркамземам і яго мясцовымі органамі, **агранамічная дапамога насельніцтву ў сучасны момант зьяўляецца побач з земляўпарадкаваньнем, мэліорацыяй,—адным з найбольш магутных рычагоў агульнай сельска-гаспадарчай політыкі Савецкай улады ў падняцьці масавай сялянскай гаспадаркі на вышэйшую ступень.**

Калі земляўпарадкаваньне дапамагае гаспадарцы прывесьці ў парадак раскіданую па палоскам зямлю, прыблізіць яе да гаспадара, зьнішчыць у гаспадарцы бескарысную трату сіл, мэліорацыя дапамагае ператварэньню нявыгадных земляў у квітнеючыя нівы, дык **агранамічная дапамога паказвае сялянскай гаспадарцы шляхі і сродкі перабудаваньня гаспадарак у больш рацыянальныя, больш прыбытковыя адзінкі.**

Было толькі 6 аграномаў.

Якая-ж была агранамічная дапамога насельніцтву, пражываўшаму ў межах сучаснай БССР у даваенны пэрыяд і разьвіцьцё яе пры Савецкай уладзе.

У трох беларускіх губэрнях: **Віцебскай, Менскай і Магілеўскай** да 1911 г. організаванай агранамічнай дапамогі насельніцтву **зусім ня было**; былі толькі асобныя аграномы ўрадавыя, мясцовых «упрошчаных» земскіх кіраўніцтваў і губэрскіх таварыстваў сельскай гаспадаркі, якія ядналі буйных паноў. Так, напрыклад, у 1910 годзе Віцебскае «упрошчанае» земскае кіраўніцтва на ўсю губэрню мела **толькі 6 аграномаў** і 3 інструктары, Менская—у гэтым-жа 1910 г. ўпяршыню запрасіла на службу **5 аграномаў**. Аб вучастковых аграномах у той час і гутаркі ня было.

Савецкія аграномы—дактары зруйнаванай зямлі.

1921 год, як вядома, быў годам найбольшага гаспадарчага крызісу. К гэтаму году адносіцца пачатак організацыі савецкай агра-дапамогі ў БССР.

Першай задачай агрономіі Беларусі была **барацьба за адбудаваньне сельскай гаспадаркі, якая была вельмі зруйнавана.**

За чатыры гады з часу ўзбуйненьня БССР агранамічная організацыя расла наступным чынам: у 1923-24 годзе было акруговых аграпрацаўнікоў (**25** чалавек, раённых аграномаў—**92** чалавекі, памоцнікаў райагранома і інструктароў—**71** чалавек, усяго раённага пэрсоналу—**163**. А ў 1926-27 годзе акруговых—**40**, раённых—**99**, памоцнікаў і інструктароў—**281**, усяго раённага пэрсоналу—**380**, а ўсяго агранамічнага пэрсоналу—**420 чалавек**. Калі-ж далучыць да гэтага і Гомельшчыну, дык апошняя лічба ўзрасьце да **464**.

Побач з колькасным ростам агранамічнай організацыі, павышаецца і процант асоб з **павялічанай кваліфікацыяй па адукацыі.**

Калі ў даваенны час аграномы былі толькі пры панскіх таварыствах, дык **нашы савецкія аграномы цалкам знаходзяцца ў сялянскіх гушчах.** Імі праведзена ў 1923-24 годзе **66 курсаў, 5043 гутарак, 82 конферэнцыі, на якіх прысутнічала каля 200.000** чалавек. У 1926-27 годзе сельска-гаспадарчых курсаў праведзена **272**, гутарак—звыш **10.000, канфэрэнцый—каля 400.** Як бачым, аграпрапаганда штогодна абуджва соткі тысяч чалавек насельніцтва. Чытаньні і гутаркі праводзіліся часта аграномамі ў сельска-гаспадарчых гуртках. У 1925-26 годзе мы мелі **778 гурткоў, якія налічвалі ў сябе 15 з паловай тысяч сяброў.**

Аграпрапаганда вялася таксама і шляхам паказальных мерапрыемстваў. У 1926-27 годзе мы мелі **3955 паказальных вучасткаў, заложаных на плошчы ў 597 дзесяцін.**

Сельска-гаспадарчыя выстаўкі, як спосаб аграпрапаганды, таксама атрымалі вялікае пашырэньне. У 1925-26 годзе было праведзена 120 выставак, удзельнічала з сваімі экспонатамі 15.000 чал. У гэтым-жа годзе было выдадзена прэмій сялянскім гаспадаркам за ўвядзеньне культурных пачынаньняў на суму **80.536 рублёў.**

За колектыўную маёмасьць.

Можна ўпэўнена сказаць, што наглядаемы за апошнія гады ўзрост спэцыяльных коопэратыўных аб'яднаньняў: **малочных, насенных, машынных, мэліорацыйных тлумачыцца іменна работай аграномаў у гэтым напрамку.**

У галіне садоўніцтва трэба адзначыць толькі асноўную работу, іменна па організацыі сеткі пладовых пітомнікаў. К сучаснаму моманту організавана новыя 24 буйныя пітомнікі на плошчы ў 203 дзесяціны з штогоднім выпускам 552.000 штук дрэўцаў.

Аграномы, ужываючы пералічаныя мэтады, старанна тлумачаць сялянству карысьць ад травасеяньня, ад увядзеньня тэхнічных культур. Напрыклад, **4 гады таму назад пад пасевам траў было 2,3 проц. ўсяе плошчы, а ў гэтым годзе ўжо 5,4 проц.**

Аграномы з году ў год агітуюць на паказальных вучастках за карысьць мінэральных угнаеньняў і **амаль зусім адсутнічаючы спрос у 1922-23 годзе на мінэральнае ўгнаеньне вырас у мінулым годзе на 715.000 пудоў.**

Аграном **Міхайлаў.**

Маем малако на продаж.

(В. Кароўчына, Лупальскі р., Магілеўшчына).

Малочныя арцелі ў разьвіцьці сельскае гаспадаркі займаюць адно з першых месц. Яны зьяўляюцца штурхачамі для падняцьця продукцыйнасьці малочнае скаціны, ставяць пытаньне перад селянінам аб правільным кармленьні жывёлы і дапамагаюць гаспадарцы перамяніць свой спажывецкі твар на тып гаспадарак прыбытковых.

У нашым раёне год таму назад было створана дзьве малочныя арцелі. Сяляне спачатку **глядзелі на арцель, як на нешта непатрэбнае і не хацелі здаваць малака. Але прайшоў год і гаспадары замест здаваемых у сакавіку месяцы мінулага году ў сярэднім 20 вёдзер малака ў дзень, у сакавіку бягучага году здавалі да 95 вёдзер.** Цяпер сярод гаспадароў ёсьць шмат зацікаўленых тым, каб дзе дастаць добрую малочную карову, навучыцца правільна карміць і г. д.

Толькі малочныя арцелі з іншымі коопэрацыйнымі аб'яднаньнямі змогуць палепшыць дабрабыт нашай вёскі.

Усачоў.



Міжнародны агляд.

ДЗЕНЬ ЗА ДНЁМ.

Французскі ўрад пачаў дзёўбаць на ангельскую вудачку.—Ні на якія новыя ўступкі Савецкі ўрад ня пойдзе.—Мы даём, але і патрабуем.—На пагрозу вайны адкажам узмацненьнем абароназдольнасьці нашай краіны.—Чарговая прагулка Чэмбэрлена.

СССР ня мае ніякіх падстаў для адкліканьня т. Ракоўскага.

Кампанія супроць СССР, якая вялася і вядзецца правымі, найбольш контр-рэволюцыйнымі коламі Францыі амаль ня скончылася няўдачай.

Французскі ўрад заявіў, што на разрыў ня пойдзе, што пытаньне аб таварышу Ракоўскім вычарпана.

І вось зараз, пасьля невялічкага перапынку, французкі ўрад паварачвае аглоблі сваёй політыкі ў другі бок.

Спачатку заблытвае пытаньне аб даўгох і крэдытах, якое амаль ня вырашана канчаткова.

А зараз, пасьля ўсіх заяў, робіць фактычны крок да разрыву з СССР. Патрабуе адкліканьня т. Ракоўскага.

Што гэта азначае? Гэта азначае раней за ўсё тое, што французскі ўрад пачаў дзёўбаць на ангельскую вудачку і ідзе на ўступку правым французскім капіталістым.

Французскі ўрад баіццаісьці проста на разрыў. Гэта сустрэла-б рашучы адпор з боку французскай рабочай клясы, сялянства, дробнай і значнай часткі сярэдняй буржуазіі, якая ня мае ніякага жаданьня ваяваць і баіцца таго, каб Англія пры падтрымальні рэакцыянэраў, не ўцягнула Францыю ў вайну.

Але па паказаньні ангельскіх нафтаўласьнікаў і консэрватыўнага ўраду, Францыя парашыла падыйсьці да справы з другога боку: патрабаваць, каб тав. Ракоўскі быў адкліканы.

Што адзначае гэтае патрабаваньне? Хіба-ж тав. Ракоўскі праводзіць якую-небудзь іншую політыку?

Вядома, не. Ён праводзіць політыку Савецкага ўраду.

Хто-б ні быў ад СССР у Францыі, наша політыка ад гэтага ні на кроплю не парушыцца.

Тое-ж, што таварыш Ракоўскі падпісаў заяву, у якой заклікаецца да пераходу салдат чужаземнае арміі на бок Чырвонай арміі, ня можа зьявіцца перашкодай у адносінах між СССР і Францыяй. Таму што кожны сябр 3-га Інтэрнацыяналу і Кім'у зробіць тое самае па гэтаму пытаньні.

Акрамя таго французскі ўрад добра разумее і ведае, што тав. Ракоўскі, больш чым хто-небудзь іншы садзейнічаў справе згоды між дзьвюма краінамі.

Значыць справа не ў асобе т. Ракоўскага, а ў тым, што Францыя пачынае хадзіць на пасадку ў ангельскіх імпэрыялістых.

Спэкуляцыя ня ўдасца.

Нашаму Саюзу выгадна мець добрыя адносіны з Францыяй у інтарэсах міру і для паляпшэньня нашага гаспадарчага становішча.

Францыі гэта выгадна таму, што дасьць ёй таннюю нафту, дасьць заказы французскай прамысловасьці. Ёй гэта выгадна таму, што значна ўзмоцніць яе політычнае становішча адносна другіх краін.

Францыі зараз ува ўсіх адносінах мэтазгодна сяброўства з Савецкім Саюзам.

З гэтай прычыны апошнюю пастанову французскага ўраду трэба разглядаць ня толькі як крок да разрыву, як перамогу рэакцыянэраў і ангельскіх нафтаўласьнікаў, але і як спробу прымусіць нас на большыя ўступкі.

Французскі ўрад добра ведае, што мы сапраўды імкнемся да міру. І вось на гэтым нашым імкненьні ён спрабуе спэкуляваць.

Французскія капіталісты і іх урад



разьлічваюць вось як: СССР дабіваецца міру, жадае не дапусьціць вайны.

У зьвязку з адкліканьнем Ракоўскага СССР на разрыў ня пойдзе, а калі і пойдзе, дык капіталістым можна будзе сказаць, што вось Савецкі Саюз ня хоча міру, зрывае адносіны і г. д.

З гэтай прычыны, разважаюць капіталістыя, паспрабуем прымусіць СССР прыслаць новага прадстаўніка. Паспрабуем яго прыцісьнуць.

Можа ён пойдзе на большыя ўступкі, заплаціць больш, а можа пойдзе і на якую-небудзь няволю.

Вось на што разьлічвае французскі ўрад і буйная буржуазія. Вось у чым сэнс іх сучасных паводзін. І тут мы павінны ім проста сказаць: **«Раз назаўсёды зарубеце сабе, паны французскія капіталісты, на носе, што гэтаму ня быць! Спэкуляваць на нашым імкненьні да міру ня ўдасца!**

Гэта верна, што мы імкнемся да міру, робім усё магчымае, каб забясьпечыць мір, наладзіць добрыя эканамічныя адносіны з іншымі краінамі. Але спекуляцыяй на спалох і пагрозамі нас ня возьмеш.

На згоды мы ідзем. Мы зробім усё, што можна, для гэтага. Але французская буржуазія няхай ня думае, што дасягне большага. Няхай ня віляе, ня круціць.

Калі-ж ня хоча згоды з намі—абыйдземся і бяз Францыі, як абыходзіліся ўжо дзесяць гадоў.

Мы даём, але і патрабуем.

У 1919 годзе, калі нам пагражала ўзброенае нападзеньне, грамадзянская вайна была ў разгары. Калі кожны дзень прыносіў з сабою быць ці ня быць рабоча-сялянскай уладзе, мы ўлічваючы гэта, прымушаны былі рабіць уступкі. У той час мы прымушаны былі гаварыць аб канцэсіях, нават адмовіцца ад абшараў, якія былі заняты контр-рэволюцыяй.

Савецкая ўлада ішла тады на такія цяжкія абавязкі толькі дзеля таго, каб зрабіць невялічкую перадышку.

Капіталістычныя дзяржавы тады не згадзіліся на нашы прапановы.

Яны намерваліся задушыць расійскую рэволюцыю, ліквідаваць назаўсёды ўладу рабочых і сялян.

Гэта ім не ўдалося.

За 10 год вольнага будаўніцтва краіны рабочых і сялян, Савецкі Саюз узмацніўся да такой меры, што рабіць компромісы, падобныя 1919 году, цяпер ужо ня час.

І наш урад зараз цьвёрда заяўляе: **мы даём, але і патрабуем.**

Сучасная ўмова дае выгаду як для СССР, так і для Францыі.

Савецкая краіна чакае вырашэньня гэтага пытаньня вельмі спакойна.

Яна з кожным днём узмацняецца і расьце. Калі мы сёньня даём такія выгады Францыі, дык мы наўрад ці згодзімся даць іх заўтра.

Але, як відаць з апошніх вестак, вырашэньне справы накіравана не на карысьць супакою.

Націск Чэмбэрлена і Дэтэрдынга (ангельскі буйны нафтаўласьнік) ажыцьцяўляецца французскім урадам.

Пагроза вайны набліжаецца.

Наша задача—рыхтавацца да абароны і ўзмацняць гэтую падрыхтоўку.

І калі французская буржуазія, кіруемая Чэмбэрленам, са зброяй у руках пагоніцца за большым, дык ня толькі яна гэтага не дасягне, а наадварот, апячэ сабе рукі.

Чэмбэрлен на прагулцы.

Па прыкладу мінулага году, Чэмбэрлен рашыў зрабіць паездку па Міжземнаму мору.

Але ў гэтым годзе яго карабель прыстаў не да італьянскіх берагоў, а да гішпанскіх.

І гутарыў ён на гэты раз не з Мусаліні, а з Прыма дэ-Рывэра—сучасным дыктатарам Гішпаніі.

Сутнасьць іх гутаркі зводзіцца да наступнага. На Паўднёва-Заходняй частцы Эўропы, дзе паўднёвы бераг Гішпаніі амаль ня зьбліжаецца з паўночным берагам Афрыкі, знаходзіцца вузкая Гібралтарская пратока.

Пратока зьяўляецца варотамі, праз якія ідзе самы кароткі шлях з Англіі ў Эгіпэт, Індыю і іншыя калёніі Ўсходу.

Вароты гэтыя маюць вялізарнае значэньне для Англіі таму, што добрая сувязь з калёніямі—гэта адзіная крыніца яе політычнай, экономічнай і ваеннай моцы.

У сучасны момант Англія моцна трымае Гібралтарскую пратоку ў сваіх руках.

Але на шляху яе ўладаньня гэтай пратокай стаіць Францыя.

І вось, каб перашкодзіць заўладаньню землямі, якія ляжаць блізка да пратокі, іншым краінам і асабліва Францыі, з гэтай мэтай і ўтварае сваю прагулку Чэмбэрлен.

Ён хоча, каб землі і гарады блізка да Гібралтару, належалі слабейшай краіне, як Гішпанія.

У гэтым сэнс яго гутаркі ў мінулым годзе з Мусаліні. У гэтым сэнс і яго сучаснай гутаркі з Прыма-дэ-Рывэра.

Алёнін.

6

Саюзныя навіны.

Вучні дапушчаюцца да зьдзельшчыны. ЦК ЛКСМБ сумесна з ЦСПСБ распрацавалі палажэньне аб дапушчэньні вучняў-падросткаў да зьдзельнай працы, калі яны атрымоўваюць па 3-4 разраду. Да зьдзельшчыны дапушчаюцца таксама вучні старэйшых груп школ ФЗВ.

Акрамя таго, ЦК прызнаў неабходным распаўсюдзіць прэміі і па падросткаў у тых прадпрыемствах, дзе існуе прэміяльная аплата.

Піонэры ў школе. ЦК ЛКСМБ падвёў вынікі работы піонэраў у школе за 1926-27 год.

Адзначаны наступныя дасягненьні: поўнае організацыйнае афармленьне фарпостаў, існаваньне іх ва ўсіх гарадзкіх школах, значнае паляпшэньне адносін настаўніцтва да піонэрпрацы і прыцягненьне ўсіх вучняў да ўсебаковага ўдзелу ў школьным будаўніцтве.

Віцебскі актыў беларусізуецца. Віцебскі акругком ЛКСМБ падвёў вынікі вывучэньня беларускай мовы комсамольскім актывам.

Выявілася, што большасьць актыву як гарадзкога, гэтак і вясковага, уладае жывой беларускай мовай. Зьвернута ўвага актыву на неабходнасьць вывучэньня гісторыі і экономікі Беларусі.

Пленум ЦБ ЮП адкладваецца. Намечаны да скліканьня 17-га кастрычніка пленум ЦБ ЮП адкладзен згодна пастановы ЦК ЛКСМБ на 24-е кастрычніка.

Павестка дню пленуму застаецца ранейшая. На пленум запрашаюцца, акрамя старшынь акруговых бюро, інспэктары піонэрруху пры Акрана.

300 тысяч экономіі.

Савецкі апарат рацыяналізаваны.

Менская акруговая кантрольная камісія падвяла вынікі рацыяналізацыі савецкага апарату ў Менскай акрузе.

Выявілася, што экономія ад ліквідацыі Барысаўскай і Слуцкай акруг складае 300.000 рублёў у год.

Праведзена работа па рацыяналізацыі і скарачэньню штатаў ва ўсіх аддзелах Менакрвыканкому.

Трэба адзначыць, што прападзольнасьць апарату як акруговага, так і раённага, пасьля рацыяналізацыі прыкметна ўзьнялася.

Кнігаабмен з заграніцай.

Белдзяржвыдавецтва наладзіла праз таварыства культурнай сувязі з заграніцай рэгулярны абмен кнігамі з замежнымі краінамі.

Кнігаабмен ахапляе навуковую і мастацкую літаратуру.

За верасень адпраўлена за мяжу 969 беларускіх выданьняў і атрымана для БССР 455 замежных кніг.

Комунальнае будаўніцтва.

Згодна пляну цэнтральнага комунальнага банку, БССР атрымае ў 1927-28 годзе на комунальнае будаўніцтва—2.800.000 рублёў.

З гэтых грошай на прамысловасьць прызначаецца 450 рублёў, каналізацыю—750.000, камунальную гаспадарку—400.000.

На адукацыю моладзі.

Па дзяржаўнаму бюджэту ў 1927-28 годзе адпушчана 25.000 рублёў на ўтрыманьне вячэрніх школ сялянскай моладзі і 18.000 руб на ўтрыманьне вячэрніх школ рабочай моладзі ў мястэчках.

Конкурс на лепшае прадпрыемства

Прэзыдыум ВСНГ пастанавіў прыняць удзел ва ўсесаюзным конкурсе на лепшае прадпрыемства, які прыстасоўваецца да 10-цігодзьдзя Кастрычнікавай рэволюцыі.

Прапанавана ўсім беларускім трэстам, дырэктарам фабрык і заводаў мобілізаваць думку ўсіх рабочых і інжынэрна-тэхнічных сіл вакол конкурсу і дасылаць весткі аб становішчы сваіх прадпрыемстваў у камісію па агляду прадпрыемстваў пры ВСНГ СССР.

Самалёт „Яўрэйскі Працоўны"

Штодня паступаюць узносы ад рабочых, служачых і саматужнікаў—яўрэяў на пабудову самалёту «Яўрэйскі Працоўны». Ужо сабрана 5.200 руб.

Мяркуецца сабраць усю суму, дастатковую для пабудовы самалёту, да 10-й гадавіны Кастрычнікавай рэволюцыі.

ІХ ЧАКАЮЦЬ ВІНТОЎКІ.

Прызыўнікі разьяжджаюцца па часьцях.

У армію пашла здаровая зьмена.

Адзенуць чырвонаармейскі шлём.

21 кастрычніка пачынаецца адпраўка ў вайсковыя часьці прызыўнікоў 1905 г., прызнаных годнымі да вайсковай службы.

Прызыўнікі прыяжджаюць на зборны пункт па дармовых ліцерах.

Абмундыраваньне яны атрымаюць зараз-жа па прыбыцьці на месца службы.

Адпраўка прызыўнікоў у часьці працягнецца да 5-га лістапада.

У армію пайшлі здаровыя.

Менская прызыўная камісія падвяла вынікі прахаджэньня прызыўнікамі мэдыцынскага агляду.

З агледжаных да 6-га кастрычніка, годнымі да вайсковай службы аказалася **48 процантаў**, абмежавана годнымі (гэта значыць толькі ў ваенны час)—**16 процантаў** і нягоднымі для службы—**11 процантаў**. 15 процантаў агледжаных атрымалі атэрмінаваньне па нязмужаласьці і 10 процантаў паслана на іспыты.

Прызыўная камісія прапушчае праз мэдагляд 50-60 чалавек у дзень. Тут-жа на аглядзе прызыўнікі атрымоўваюць належныя пасьведчаньні.

Клюб прызыўнікоў.

На прызыўным пункце абсталяваны вялікі клюб, які з учарайшага дню пачаў работаць.

Пры клюбе маюцца стралковы і мячавы ціры, праводзяцца прэміяльныя конкурсы па шахматах і шашках.

Кніжку прызыўніку.

Пушкінская бібліотэка організавала бібліотэку-перасоўку для забесьпячэньня прызыўнікоў кніжкамі.

Перасоўка ўжо працуе.

Кастрычнік ідзе.

У Доме Селяніна.

Цэнтральны Дом Селяніна адзначае 10-ю гадавіну Кастрычнікавай рэволюцыі пашырэньнем інтэрнату для прыяжджаючых, папаўненьнем бібліотэкі новымі кнігамі і плякатамі аб Кастрычніку і ўстанаўленьнем радыё-прыёмніка з гучнагаварыцелем. У дні сьвята пры ЦДС адчыніцца выстаўка, дзе паміж іншым, будуць выяўлены дасягненьні Дому за час яго існаваньня.

Наладжваецца шэраг лекцый, гутарак з прыяжджаючымі сялянамі аб 10-й гадавіне Кастрычніка і дасягненьнях сельскай гаспадаркі за гэты тэрмін.

Адчыняцца школы

У Кастрычнікавыя сьвяты насельніцтва Койданаўскага раёну, (Меншчына) будзе сьвяткаваць адчыненьне новых школ і райнардому. Да 10-цігодзьдзя Кастрычніка таксама прыстасоўваецца выпуск сялянскіх дэлегацкіх сходаў.

Новы вадаправод.

У Бабруйску рыхтуецца да 10 гадавіны Кастрычніка акруговая выстаўка, якая пакажа гаспадарчыя і культурныя дасягненьні акругі,

У горадзе будзе адчынен новы вадаправод.

Па сельска-гаспадарчай лініі да сьвята прыстасоўваецца організацыя ў раёнах цэлага шэрагу мэліорацыйных, машынных і іншых таварыстваў.

Сельска-гаспадарчая выстаўка.

У Слуцкай акрузе да 10-й гадавіны Кастрычніка дапасоўваецца адчыненьне вялікай сельска-гаспадарчай выстаўкі.

Акрамя таго, у дні сьвята ў горадзе адбудзецца адчыненьне двух-гадовых настаўніцкіх курсаў, новага працколектыву для беспрацоўных дрэваапрацовачнікаў і рабоча-партыйнага клюбу ў новым памяшканьні.



У судзе.

Эпілёг аднаго «романа».

Аб ім адразу-ж загаварылі ў маленькім горадзе. Яшчэ тры гады таму назад малады Осіпаў нічым не адрозьніваўся ад астатніх хлапцоў гораду Рослаўлю (Смаленскай губэрні), а вось цяпер на яго зьвярацілі увагу бадай усе жыхары.

Пасьля трохгадовай адсутнасьці, ён зноў зьявіўся ў Рослаўлі.—зьявіўся студэнтам маскоўскага унівэрсытэту і ўтварыў эфэкт сваімі сталічнымі манэрамі.

Былі каляды... І на аднэй з вечарынак Осіпаў пазнаёміўся з вясёлай дзяўчынкай Разаліяй Кэйвін. Пасьля гэтага, яны пачалі часьценька сустракацца. Скончыліся канікулы— і Осіпаў зноў паехаў у Маскву.

Хутка прайшлі 6 месяцаў, і Осіпава зноў убачылі на вуліцах Рослаўлю. Ён упарта і настойліва пачаў дабівацца каханьня Разаліі.

У адзін з чэрвеньскіх вечароў.. Разалія аддалася яму.

Дзіўна, што працяг гэтай „романтычнай" гісторыі адбыўся гэтымі днямі ў... нарсудзе 1-га вучастку г. Менску. За год адбылося шмат зьменаў. Кэйвін з дзіцянём пераехала ў Менск, Осіпаў скончыў унівэрсытэт, атрымаў пасаду памоцніка начальніка шляхоў зносін МББ чыгункі, і пераехаў у Полацак на працу.

На судзе Осіпаў гаворыць:

— Тое, што я з ёю быў у сувязі—правідлова. Але шмат хто кажа, што за ёю ухажывалі таксама Слуцкі і Саўко. Мабыць дзіцяне і не маё.

— „Мабыць"—ня лічыцца,—адказаў на гэта судзьдзя і агаласіў пастанову: Осіпаву штомесячна выплачваць на ўтрыманьне дзіцяці 15 рублёў да паўналецьця.


ЭМТ.

№ 7 Шахматы і шашкі № 7

Пад рэдакцыяй П. Ліпкінда

Задача № 8.

Мокеля (Віцебск).




Белыя: Кре2, Фа6, Ка5, пп: b4, g4... (5)

Чорныя: Кр. d4, Ch4, Ch8, пп: d5, e4...(5)

Мат у 2 хады.

Эцюд № 3 (Шашачны)

Левіна І. (Барысаў).



Белыя: Д—b4, пп: d2, f4...(3)

Чорныя: Д—g1, пп: c7, d4, h4, h8... (5)

Белыя пачынаюць і робяць нічыю.

V ўсесаюзны шахзьезд.

У камандных спаборніцтвах СССР, Беларусь перамагла мацнейшыя каманды.—Наша каманда ідзе на першым месцы.

Шахматны чэмпіонат.

Пасьля сямі тураў гульні ў чэмпіонаце СССР, становішча наступнае: Ільлін-Жанеўскі +6 (з 7-мі); Багатырчук +3 (з 4-х); Дуз-Хацімірскі, Модэль і Рамаюўскі + 4½ (з 6-ці); Ненарокаў +4 (з 5-ці); Вільнер +3½ (з 6-ці); Бацьвіньнік +2 (з 3-х); Раузэр +3 (з 6-ці); Макагонаў +2½ (з 5-ці); Пярфільлеў і Рабіновіч +2 (з 5-ці).

Камандныя спаборніцтвы.

Беларусь ідзе наперадзе.

Пачаліся камандныя спаборніцтвы СССР. У спаборніцтвах прымаюць удзел наступныя 11 каманд (па 5 чалавек у кожнай): узбэкістанская, цэнтральнай прамысловай вобласьці, чорназемнай вобласьці, Уралу, Беларусі, Масквы, Украіны, Казакстану, Паўночна-Заходняй вобласьці, Азэрбайджану і Ленінграду.

У першым туры **Беларусь выіграла ў Казакстану:** Блюмбэрг (Беларусь) 0 — Крушынскі (Казакстан) 1, Маневіч (Бел.) 1 — Одаяш (Каз.) 0, Сіліч (Бел.) 1—Шан-Бекаў (Казак.) 0- Тышлеп (Бел.) 1—Ваинштайн. (Каз.) 0. Партыя Сташэўскага была адкладзена.

У другім туры Беларусь выіграла у каманды Паўночна-Заходняй вобласьці. Сіліч (Бел.) выіграў у Машарова (П.—З. вобл.), Маневіч (Бел.) выіграў у Підкевіча (П.—З. вобл.). Тышлер (Белар.) выіграў у Ягдафельда (П.—З. вобл.)

У трэцім туры. Беларусь выіграла у Азэрбайджану і ў 4-м у Ленінграда.

Пасьля 4-га туру, у камандных спаборніцтвах на першым мейсцы ідзе Беларусь. на 2-м—каманда цэнтральнай прамысловай вобласьці,

Шахматна - шашачныя навіны.

Менск. У нядзелю, 9-га кастрычніка, у шахматна-шашачным клюбе вучнёўскай моладзі (Ленінская, 21) пачынаецца шахматны чэмпіонат клюбу. Пераможнікі чэмпіонату ўвойдуць у агульна-гарадзкі шахматны турнір Менску. Гульня будзе адбывацца па нядзелях і пятніцах.

Мазыр. 2-га кастрычніка пачаўся масавы шахматна-шашачны турнір моладзі. У ім прымаюць удзел 32 чал.

Пераможнікам будуць выдадзены прызы на агульную суму 20 руб. Турнір працягнецца каля месяцу.

Куды пайсьці.

У памяшканьні кіно «Культура» адбываюцца апошнія гастролі Маскоўскага Яўрэйскага Камэрнага Тэатру. Сёньня ідзе зачынены спэктакль для сяброў профсаюзу будаўнікоў—«**Труадэк**». Заўтра пойдзе—«**Падарожжа Вэніяміна Трэцяга**».

У цырк і кіно.

Белдзяржкіно і цырк адпушчаюць па 31 пропуску ў дзень для дармовага наведваньня прызыўнікамі кіно-сэансаў і цырку.

З набліжэньнем тэрміну адпраўкі прызыўнікоў у часьці лік пропускаў будзе павялічан.

На хвалі 500 мэтраў.

(Менская радыё-станцыя Імя Саўнаркому БССР).

Сёньня перадаецца наступная програма: 7 г. 00 хв.—Радыё-газэта—„**Чырвоная Зьмена**"; 7.30.—**Радыё-газэта № 173:** 8.15.—Гутарка ТСА-Авіяхіму—„**Знадворная і ўнутраная абстаноўка Кастрычнікавай рэволюцыі і ТСА-Авіяхім**"; 8.45.—Гутарка ЦК ЛКСМБ—„**Удзел піонэраў у тыдні аховы здароўя дзяцей**"; 9.15.—**Вечар скокаў.**


Заўтра перадаецца: 6.00.—Даклад ВСНГБ—«**Прамысловасьць у БССР**»: 6.30.—„**Беларуская Вёска**" па радыё; 7.15. — „**Беларускі Піонэр**" па радыё; 7.45.—**Навіны радыё па радыё**; 8.15.—**Концэрт**.

У панядзелак будзе перадана;—7.00.—Гутарка па радыё-тэхніцы—„**Ёмкасьць**"; 7.30—**Радыё-газэта № 174:** 8.15. — Гутарка — „**СССР—Саюз працоўных усіх нацыянальнасьцяў**"; 8.45.—**Концэрт** з падобрам вумароў з цыклю—„ **Вясёласьць і гумар у музыцы**".

НАВУКА і ЖЫЦЬЦЁ.

Стальны грабар.

Няма, пэўна, больш цяжкай працы ў будаўнічай справе, чымся праца грабара, якому, як гэта ня дзіўна, да гэтай пары амаль ня прыходзіла на помач сучасная тэхніка. Ён усё яшчэ марудзіць са сваёй рыдлёўкай, і пры вялікай напружанасьці сваіх сіл найбольш кваліфікаваны грабар можа ў рабочы дзень выкапаць толькі 10—12 куб. мэтраў зямлі. Зразумела, што гэткая нізкая вытворчасьць працы не здавальняе сучаснай тэхніцы, якая мае справу з вялізэзнымі землянымі работамі.



Стальны грабар.

Асабліва рэзка адсутнасьць мэханізацыі ў земляных работах адчуваецца пры праводцы электрычнай лініі ад станцыі к гораду (як гэта будзе ў нас на Асінастроі). Дзеля гэтай праводкі трэба ўстанаўліваць вялікія мэталёвыя слупы. Капаньне ямаў для гэтых слупоў амаль заўсёды прыходзіцца ўтвараць на працягу дзесяткаў вёрст, у глухой мясцовасьці.

Нядзіўна, што цягнуць з сабою вялікую колькасьць грабароў уздоўж усёй лініі ўстаноўкі зьяўляецца справай дарагой і цяжкай.

Таму, за мяжой за апошнія часы зьявілася надзвычайна цікавая буравая машына, якая бліскуча выконвае марудную і складаную работу па капаньні ямаў для гэтых слупоў.

Машына вельмі лёгка ўстанаўліваецца на звычайным грузавіку і працуе ад аўтамабільнага матору, патрабуючы для свайго абслугоўваньня ўсяго толькі 2 чалавек. Вынікі-ж работы дзіўныя: у 8-гадзінны рабочы дзень машына можа зрабіць 50 ямаў па 2 мэтры ў глыбіню і ў 1 аршын шырынёю.

Ніякіх спэцыяльных ведаў для абслугоўваньня машыны не патрабуецца.

Узьнята пытаньне аб вырабе такіх машын і ў СССР, дзе яны-б шмат чым дапамаглі пры ажыцьцяўленьні грандыёзнага пляну электрыфікацыі краіны.

Аўтомобільны мэтрополітэн.

Аўтомобіль—асноўны спосаб перасоўваньня амэрыканцаў. Нядарма ў іх умацавалася думка: кожная амэрыканская буржуазная сям'я, павінна мець ня менш 3-х аўтомобіляў: адзін для гарадзкіх пагулянак, другі—для загарадных, а 3-ці—для прыслугі, у якім яна павінна езьдзіць у лаўкі за пакупкамі. І, сапраўды, амэрыканская аўтомобільная армія расьце з казачнай хуткасьцю: у 1915 годзе, напрыклад, у Нью-Ёрку было 240 тысяч аўтомобіляў і за 6 год гэты лік пераваліў (да 1921-га году) за 1 мільён.

Таму ня дзіўна, што амэрыканцы прымаюць усе магчымыя меры, каб найбольш удобна абсталяваць аўтомобільны рух на вуліцах вялікіх гарадоў, дзе «аўтомобільная мешаніна» дасягнула надзвычайных разьмераў.

Дзеля гэтай мэры нядаўна ў Чыкага пабудаваны «аўтомобільны мэтрополітэн"—шырокі бэтонны надземны шлях, які прызначаецца выключна для аўтомобіляў.

Шлях гэты ўстаноўлены на слупох і падняты так высока, што зусім ня шкодзіць вулічнаму руху.

Практыка існаваньня гэтага „мэтрополітэну" паказала яго вялізарную каштоўнасьць і зараз вырашана ня толькі пашырыць гэты шлях, але і пабудаваць гэткія-ж у шэрагу іншых амэрыканскіх гарадоў.

Адказныя рэдактары: А. БАРАНЬНІКАЎ. А. КУРЦІК.

Галоўлітбел № 24867 Менск, 1 друкарня БДВ.